на планшете из досок разыграть спектакль, это было убедительно, эмоционально, предмет «заговорил» и заставил зрителя слушать. Доски двигались и застывали, переносили героев в замок, в лес, к болоту, они затягивали персонажей, заставляли бояться. Планшет был полом, столом, местом встречи влюбленных, дверью.

Можно сделать вывод о том, что удачное решение сценографии, реквизита не только обогащает задуманное режиссером, но и открывает новые возможности выражения художественного образа спектакля.

Таким образом, реальность спектакля является вещественным, действительным миром, который создается режиссером, совместно с драматургом и художником и включает в себя предметный мир, который либо дополняет игру актера, либо играет наравне с ним, соперничает и завоевывает пространство сцены и внимание зала.

**Литература**


1. Попов А.Д. Творческое наследие. М.: Всероссийское театральное общество, 1979. — 517 с.
2. Философский энциклопедический словарь. М.: Из — во «Сов. энциклопедия», 1983. 880 с.
3. Мастерство режиссера/Под общей редакцией А.Н. Зверевой. — М.: ГИТИС, 2002. — 472 с.
4. Березкин В.И. Польский театр художника: Кантор, Шайна, Мондзик/ — М.: Аграф,2004. 336 с.
5. Э.Г. Крэг: Воспоминания. Статьи. Письма/М.: Искусство,1988. 399 с.



*Трапянок У.А.*
*Белтэлерадыёкампанія, Мінск*


## ТЭАТР У ЭФІРНАЙ ПРАСТОРЫ БЕЛАРУСІ: ГІСТОРЫЯ, СУЧАСНАСЦЬ, ПЕРСПЕКТЫВЫ

Першапраходцамі радыётэатра называюць англічан: у 1924-м годзе па радыё яны перадалі драму Рычарда Х'юза «Небяспека». Як хутка і ці надоўга новая з'ява ў радыёвяшчанні прыжылася ў нашай



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

краіне? Якое месца спектаклю адводзілася ў эфіры Беларускага тэлебачання?

15-га лістапада 1925 года пачалася гісторыя Беларускага радыё. Мастацкае слова ў нацыянальным эфіры загучала амаль з першых дзён. Яго масаваму распаўсюджванню паспрыяла стварэнне рэдакцыі літаратурна-драматычнага вяшчання. Працавалі з рознымі жанрамі і формамі, айчынная літаратура заняла пачэснае месца ў праграмах Беларускага радыё. Вялікая ўвага надавалася творчасці літаратараў з усяго СССР. Літаратурныя праграмы, нароўні з музычнымі, даволі хутка сталі папулярнымі.

Асаблівае месца ў рабоце рэдакцыі займалі радыёспектаклі — найвышэйшая форма літаратурна-драматычнага вяшчання. Спосаб успрымання радыё — акустычны, таму пастаноўкі ажыццяўляліся з прымяненнем выразных сродкаў, не падобных да тых, што выкарыстоўваліся на сцэне. Перад мікрафонам спачатку працавалі дыктары, а пазней і вядомыя майстры айчыннай сцэны — Л. Рахленка, З. Стома, В. Тарасаў, З. Браварская, Л. Давідовіч, М. Захарэвіч, П. Дубашынскі і інш.

З 1939 года ў праграмы цэнтральнага, а потым мясцовага вяшчання ўключаліся трансляцыі непасрэдна з тэатральных пляцовак. Пачаткам стала перадача з МХАТа «Ганны Карэнінай». Тады ж уведзена практыка абавязковага абмену запісамі. У фанатэку Беларускага радыё перадаваліся спектаклі з Масквы, Ленінграда, Кіева, Тбілісі, Львова. Лепшыя пастаноўкі, запісаныя на Беларускім радыё, выходзілі ў эфір на ўсесаюзным радыё — спектаклі «Каб узышло сонца», «Песня Дзвіны», «Бацькаўшчына», «Самы высокі паверх». Неаднаразова беларускія радыёпастаноўкі прывозілі дыпломы з конкурсаў.

Эпоха Беларускага тэлебачання пачалася ў 1956-м годзе. Тады ж адзначалася 75-годдзе з дня смерці рускага пісьменніка Ф. Дастаеўскага. Да гэтай падзеі айчынныя тэлевізійшчыкі на чале з рэжысёрам Ус. Кухтам ажыццявілі пастаноўку першага беларускага тэлеспектакля «Сяло Сцяпанчыкава і яго жыхары». Потым адну за адной на экранах прадэманстравалі трагедыі А. С. Пушкіна «Каменны госць», «Моцарт і Сальеры», серыю з працягам «Клуб славутых капітанаў», інсцэніроўку «Соцкі падвёў» паводле апавядання Я. Коласа. Тэлевізійныя спектаклі, створаныя на мінскай студыі, трансліравалі амаль кожны месяц.

У сярэдзіне 60-х гадоў гледачы мелі магчымасць па тэлебачанні глядзець спектаклі Беларускага тэатра імя Я. Купалы, Рускага тэатра імя



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

М. Горкага, віцебскага тэатра імя Я. Коласа, ТЮГа БССР, а таксама творчых калектываў абласных тэатраў. У эфір выходзілі пастаноўкі МХАТа, Малога тэатра Расіі, а таксама з Ленінграда, Кіева, Вільнюса, Львова.

Асаблівае месца на экране займалі экранізацыі твораў беларускіх пісьменнікаў. Сярод аўтараў — І. Шамякін, У. Караткевіч, П. Броўка, К. Чорны, Я. Колас, К. Губарэвіч. Вялікімі літарамі ў гісторыю айчыннага тэлебачання ўпісаны двухсерыйны тэлеспектакль «Крах» і трохсерыйны спектакль «Людзі на балоце». Гэтыя работы трансліраваліся на ўсесаюзным тэлебачанні.

Пераломнымі ў гісторыі айчыннага тэле- і радыёвяшчання сталі апошнія гады мінулага стагоддзя. Беларускае тэлебачанне перастала займацца вытворчасцю тэлеспектакляў, спынілася і іх трансляцыя. З сярэдзіны 90-х фонды Беларускага радыё не папаўняюцца запісамі, зробленымі ў Расіі. Вядзецца рэстаўрацыя фондавых запісаў. На сённяшні дзень самая старая з перапісаных на лічбавыя носьбіты радыёпастаноўка па рамане Чарльза Дыкенса «Домбі і сын» 1949-га года (МХАТ, г. Масква). Працай па рэстаўрацыі фондавых запісаў займаецца Студыя аднаўлення фанаграм.

За апошніх 6 гадоў у студыях Дома радыё створаны толькі 6 спектакляў: «Ігнатаў рубеж» паводле Васіля Ткачова (да 20-годдзя Чарнобыльскай катастрофы, 2006); «Паэт і дзяўчына», аўт. інсцэніроўкі П. Васючэнка (да 125-годдзя з дня нараджэння Янкі Купалы, 2007); 2009-ты –«Крыж» (аўт. А. Дудараў), «Пастка» (аўт. В. Быкаў); 2010 — «Магнаты і сірата. Соф'я, князёўна Слуцкая» (аўт. Ул. Сыракомля); 2011 — радыёверсія спектакля Нацыянальнага акадэмічнага тэатра імя Янкі Купалы «Тутэйшыя» паводле Я. Купалы.

Спектаклі з фондаў Беларускага радыё гучаць па выхадных у эфіры Першага Нацыяльнага канала Беларускага радыё і канала «Культура», на якім таксама запатрабаваны «літаратурны тэатр»: чытанні айчыннай і замежнай літаратуры ў прамым эфіры ці ў запісе гучаць штодзённа.

У стварэнні новых радыёспектакляў існуюць пэўныя хібы: адсутнасць актуальных радыёп'ес, недахоп фінансаў, а таксама прафесійных кадраў (ліквідаваныя рэдакцыя літаратурна-драматычнага вяшчання, штат аддзела рэжысёраў скарочаны да мінімуму). Адсутнічае «стымулюючы» фактар — няма ўзаемаабмену з іншымі рэдакцыямі, адпаведных конкурсаў і фестываляў. Ды і само радыё страціла лідзіручыя пазіцыі сярод СМІ.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У эфірнай сетцы Беларускага тэлебачання месца для трансляцый спектакляў не адведзена ўвогуле. Магчыма, кампенсуе прагал з'яўленне новага тэлеканала «Беларусь-3» (аналаг расійскага тэлеканала «Культура»).

*Черняк Л.И.*
*БГАМ, Минск*

**ДОМРА И МАНДОЛИНА: РЕАЛИИ И ПЕРСПЕКТИВЫ**

В настоящее время в Республике Беларусь сложилась высокопрофессиональная исполнительская и педагогическая школа домрового, мандолинного искусства. Сложившаяся система непрерывного получения профессионального музыкального образования (школа–ссуз–вуз) опробированая десятилетиями практики, победами на престижных международных конкурсах исполнителей, активной концертной деятельностью домристов–мандолинистов.

В государстве проводится Республиканский открытый конкурс исполнителей на народных инструментах им. И.И. Жиновича для двух ступеней образования: учащихся музыкальных школ, школ искусств и учащихся колледжей–лицеев.

Высшей точкой конкурсной жизни для представителей народного искусства в Республике Беларусь является Международный конкурс им. И.И. Жиновича, на который съезжаются представители различных национальных школ, что является, само по себе, показательным, поскольку служит школой высшего исполнительского мастерства как для педагогов, так и для исполнителей, а также заинтересованных благодарных слушателей, которых у нас, к счастью, достаточно.

Вершина выстроенной «пирамиды» в виде музыкального конкурса исполнителей на народных инструментах подчеркивает актуальность и значимость такого явления, как народное исполнительское искусство в нашей стране.

В рамках тесного сотрудничества с музыкантами из Европы, Японии, Китая проходят мандолинные ассамблеи, концерты, мастер–классы известных педагогов, исполнителей, которые лишний раз

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ